**УДК 394.2(476.5)"14/17"** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-28-34**

# АФІЦЫЙНЫЯ ЎРАЧЫСТЫЯ ЦЫРЫМОНІІ Ў ПОЛАЦКІМ І ВІЦЕБСКІМ ВАЯВОДСТВАХ (ЗЕМЛЯХ) У XV – XVIII стст.

***канд. гіст. навук, дац. А.А. СКЕП'ЯН***
***(Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміи навук Беларусі, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0001-7163-2492***

*Адным з галоўных механізмаў, якія аб'ядноўваюць людзей, фарміруюць і дэманструюць пэўную сістэму каштоўнасцей, адрозненні ва ўспрыманні навакольнага свету, з'яўляецца ўрачыстасць, свята. Яны адзначаюць найважнейшыя вехі чалавечага жыцця: асабістага (нараджэнне, уступленне ў шлюб, смерць) і грамадскага. Ужо ў пачатку XV ст. у гарадах і мястэчках Вялікага Княства Літоўскага пачынае фарміравацца своеасаблівая гарадская культура. Яе неад'емнай часткай становяцца розныя цырымоніі, шэсці, трыумфы, прымеркаваныя да свецкіх і царкоўных свят і нагод. Ва ўмовах гвалтоўнага закрыцця праваслаўных храмаў і манастыроў, распаўсюджвання ўніяцтва менавіта гарадское свята стала тым мостам, які аб'ядноўваў жыхароў горада розных канфесій і сацыяльных пластоў.*

***Ключавыя словы**: гарадская культура, урачыстасці, цырымоніі, царкоўныя і свецкія святы, Вялікае Княства Літоўскае, Падзвінне.*

**Уводзіны**. Неад'емнай часткай чалавечага жыцця на ўсіх этапах з'яўляліся святы. Без разумення феномена афіцыйнай святочнай культуры немагчыма зразумець культурныя своеасаблівасці развіцця гарадоў Беларусі. М. Бахцін наогул лічыў святы «вельмі важнай першапачатковай формай чалавечай культуры» [1, с. 11]. У другой палове XX – пачатку XXI ст. святочная культура, асабліва эпохі еўрапейскага Сярэднявечча стала прадметам вывучэння прадстаўнікоў сусветнай навуковай і філасофскай думкі, як у культуралагічных, так і гістарычных даследаваннях. Гэта было абумоўлена ўсведамленнем той акалічнасці, што свята за кошт сваёго сімвалізму, відовішчнасці адыгрывае надзвычай важную ролю як у функцыянаванні любой цывілізацыі і культуры, так і дыялогу паміж імі. Яны ладзіліся з сямейных і рэлігійных нагод і звязвалі традыцыйныя і новыя, рэгіянальныя і агульнадзяржаўныя, свецкія і рэлігійныя сферы жыцця соцыума.

Першымі пад ўвагу даследчыкаў трапілі розныя катэгорыі культуры і ўрачыстасці ў заходнееўрапейскіх гарадах і пры дварах еўрапейскіх манархаў эпохі Сярэднявечча. Штуршок да іх вывучэння дала знакамітая школа "Аналаў". Вынікам узрастання ўвагі да духоўнай спадчыны, святочнага і паўсядзённага жыцця сярэднявечнага еўрапейскага горада стала багатая гістарыяграфія. Сярод розных твораў, прысвечаных праблемам свята, смеха, асобна можна ўзгадаць творы Ж. Ле Гоффа, М. Бахціна, А.Я. Гурэвіча, У.П. Даркевіч [2; 1; 3; 4]. Святочная ж культура як жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага наогул, так і Падзвіння ў прыватнасці доўгі час з'яўлялася прадметам даследавання пераважна этнографаў і фалькларыстаў, якія накіроўвалі асноўную ўвагу на сялянскае асяроддзе. Пазней прыйшла цікаўнасць да культуры шляхецкага саслоўя, якая задавала моду, вызначала асноўныя кірункі, у якіх рухалася грамадства. Не апошнюю ролю ў фарміраванні гэтага інтарэсу адыграла праца А. Мальдзіса [5]. Вывучэнне гарадской святочнай культуры на беларускіх землях доўгі час вялося толькі па яго асобных аспектах: развіццё тэатральнага і музычнага мастацтва (В. Дадзіёмава, Г. Барышаў) [6–8], школьнай асветы, жыцця і дзейнасці найбольш выдатных яе прадстаўнікоў (напрыклад, Францыска Скарыны [9] ці Сімяона Полацкага), тады як святочная культура як феномен заставалася па-за ўвагай даследчыкаў. Першымі паспрабавалі абагульніць напрацоўкі розных галін навукі супрацоўнікі Інстытута этнаграфіі і фальклора АН БССР, плёнам працы якога стала калектыўная манаграфія, прысвечаная гарадскому побыту і культуры [10]. Непасрэдна развіццё гарадской святочнай культуры стаў вывучаць А. Катлярчук, які ў сваёй манаграфіі, прысвечанай святочнай культуры гарадоў Расіі і Беларусі XVII ст. паспрабаваў прааналізаваць агульнае і асаблівае для гэтых рэгёнаў і рэканструяваць шэраг цырымоній [11].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз асаблівасцей развіцця розных афіцыйных урачыстасцей у Падзвінні XV – XVIII стст. Менавіта публічныя свецкія і рэлігійныя святы не проста прыцягвалі ўвагу жыхароў рэгёна, а адбываліся пры непасрэдным удзеле прадстаўнікоў розных слаёў гарадскога насельніцтва, нягледзячы на этнічную ці рэлігійную прыналежнасць.

**Асноўная частка**. Паўсядзённае жыццё XV – XVIII стст. з яго штодзённымі клопатамі расквечвалі забавы і святы. У гарадской культуры ўсе святы ўмоўна існавалі ў публічнай (кірмашы, гарадскія і рэлігійныя святы) і прыватнай (сямейнай) прасторы. Тады як у сельскай мясцовасці свецкія святы па-ранейшаму абмяжоўваліся сямейнай прасторай, а рэлігійныя нярэдка дапаўняліся паганскімі абрадамі ў выглядзе калядавання і шчадравання, хаджэння валачобнікаў на Вялікдзень.

Этнічныя, рэлігійныя і рэгіянальныя асаблівасці культуры даўжэй за ўсё захоўваліся ў сямейна-побытавай сферы, дзе святы адзначаліся згодна з традыцыямі, тады як на публічныя, рэлігійныя святы аказвалі ўплыў розныя фактары і культурныя традыцыі. Менавіта распаўсюджванне свецкіх публічных цырымоній, звязаных у тым ліку і з атрыманнем права гарадоў на самакіраванне, паглыбляла адрыў гарадскіх паселішчаў ад вясковага насельніцтва, спрыяла канчатковаму адасабленню гарадской культуры ад сялянскай. Спрыяў гэтаму і дазвол выязду падданых вялікага князя літоўскага за мяжу на навучанне ці па гандлёвых справах, які гарантаваўся заканадаўчымі актамі на працягу некалькіх стагоддзяў і быў замацаваны арт. 16 разд. 3 Статута ВКЛ 1588 г. [12, с. 120].

Важнай часткай гарадской культуры з’яўляліся афіцыйныя святочныя цырымоніі. Згодна з класіфікацыяй А. Катлярчука, да афіцыйных цырымоній можна аднесці агульнадзяржаўныя і агульнагарадскія святы, важныя дынастычныя падзеі (напрыклад, каранацыі), царкоўныя святы агульнадзяржаўнага характару, ваенныя агляды і парады мяшчан, асобныя святы і шэсці гарадскіх і мяшчанскіх карпарацый (цэхаў) [11, с. 8]. Усіх іх аб’ядноўвала суіснаванне ў публічнай прасторы, нярэдка спалучэнне ўрачыстага (шэсці, трыумфальныя вітанні) і забаўляльнага (музычнае суправаджэнне і паратэатральныя відовішчы).

Адной з важнейшых падзей агульнадзяржаўнага і агульнагарадскога ўзроўню з’яўляліся візіты манархаў, найвышэйшых свецкіх ці духоўных асоб, замежных пасольстваў. З XV ст. становіцца звычайным правядзенне ўрачыстых свецкіх святаў, напрыклад, сустрэч манархаў, якія адбываліся па пэўным сцэнары і ставілі перад сабою некалькі мэтаў. Яны паказвалі як вернасць і прыхільнасць мясцовых жыхароў прадстаўнікам цэнтральнай улады, так і спрыялі аб’яднанню розных груп жыхароў у адзіныя мяшчанскае і шляхецкае саслоўі. З другога боку ўлады таксама разумелі важнасць цырымоніі ўрачыстых сустрэч, якія маглі прадэманстраваць мясцовым жыхарам моц цэнтральнай улады, стабільнасць у дзяржаве, падкрэсліць ласку да пэўных асоб ці краін, пры арганізацыі сустрэчы пасольстваў. Арганізацыя такіх візітаў кантралявалася дваром манарха і за аснову браліся прыдворныя цырымоніі і ўрачыстасці сталічнага горада – Вільні, што ў выніку спрыяла сінтэзу традыцый і культур на ўсходзе Беларусі. Такі візіт падкрэсліваў і сам статус горада, з’яўляўся маркерам яго важнасці для дзяржавы. Не апошнюю ролю адыгрывалі не толькі асобы сустракаючых, але і парадак шэсця, атрыбуты, з якімі выступалі ўдзельнікі ўрачыстых цырымоній, вопратка, ежа, аздабленне вазоў, пабудоў. На вялікі жаль, да нас дайшлі апісанні не ўсіх візітаў манархаў і звестак пра цырыманіял іх вітання на працягу аналізуемага перыяду. Так, амаль нічога не вядома, як сустралі віцябляне вялікіх князёў Ягайлу і Вітаўта ў 1411 г. Аднак захавалася апісанне ўрачыстага вітання жыхарамі Віцебска ў 1413 г. вялікага князя Вітаўта, які аб’язджаў розныя землі ВКЛ. Сустракаць князя з аршакам і войскам да Заходняй Дзвіны выйшлі паасобку ў шэсці каталікі (“фратры і чесные хрістиане”) з харугвамі і машчамі святых і праваслаўныя віцебляне са сваёй працэсіяй з абразамі, харугвамі і машчамі [12, с. 27]. Усяго ў натоўпе сведкі налічылі ад чатырох да пяці тысяч чалавек [14, с. 27].

Праз Віцебск і Полацк не праходзіў асноўны тракт, па якому рухаліся афіцыйныя дэлегацыі. Звычайна пасольствы з Вільні накіроўваліся ў Маскоўскую дзяржаву па смаленскай дарозе праз Воршу. Урачысты іх прыём прадугледжваўся толькі пры набліжэнні да рэзідэнцыі манарха. Аднак у лютым 1495 г. парадак прыёму, размяшчэння і маршрут маскоўскага пасольства быў зменены і набліжаны да традыцыйнага маршрута аб’езда зямель вялікім князем літоўскім. Шлях ляжаў са Смаленска на Віцебск, потым на Полацк і, праз Крэва, – на Вільню.

Цырымонія вітання дачкі вялікага князя маскоўскага Івана III Алены і асоб, што яе суправаджалі, была спалучана са знаёмствам з новымі землямі і будучымі падданымі. Магчыма, гэта было зроблена і таму, што ў складзе пасольства да маскоўскага двара, што сватала дачку Івана III, былі кіраўнікі падзвінскіх ваяводстваў і земляў: віленскі кашталян і гарадзенскі намеснік, князь Аляксандр Гальшанскі, жмудскі староста і полацкі намеснік Ян Забярэзінскі з сынам, браслаўскі намеснік Юрый Зяновіч, а таксама і палачане: два Карсаковіча і Сенка Епімахаў [15, с. 160]. Іван III хацеў, каб на мяжы дачку сустракаў адзін з бліжэйшых родзічаў Вялікага князя Аляксандра: князь Сямён Міхайлавіч Алелькавіч. За некалькі год да таго ён выступаў асноўным прэтэндэнтам на вялікакняжацкі сталец, напрамую пагражаючы пераемнасці Ягелонаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Ён мог вітаць маскоўскую вялікую князёўну не проста як будучы падданы, а як роўны ёй і яе будучаму мужу па крыві (ён прыходзіўся князёўне траюрадным дзядькам). Толькі яму дазвалялася ехаць з Аленай Іванаўнай у возе, пацясніўшы адну з суправаджаючых яе жанчын, а менавіта жонку аднаго з кіраўнікоў маскоўскай дэлегацыі Міхайлы Якаўлевіча Марозава, Русалкі [15, с. 167]. З неясных прычын князь Сямён Алелькавіч не проста не прыехаў на мяжу вітаць будучую вялікую княгіню, але і нават не з’явіўся ні на водным з этапаў яе падарожжа па краіне, у адрозненні ад іншых паноў-радных. Магчыма, гэта стала чарговай дэманстрацыяй яго стаўлення да Вялікага князя і падкрэсліваннем свайго роўнага Ягайлавічу статуса. Другім варыянтам развіцця падзей магло стаць нежаданне самаго вялікага князя дапусціць кантакт нелаяльнага падданага з маскоўскім бокам.

Пасольства, у якім налічвалася больш за 100 чалавек [15, с.164], было сустрэта ў двух вёрстах ад Віцебска мясцовым намеснікам кн. Міхалам Заслаўскім з дзецьмі баярскімі і ўсімі жыхарамі. Адзін з кіраўнікоў маскоўскага пасольства, князь С. Рапалоўскі, прадставіў віцебскага намесніка вялікай князёўне, і дэлегацыя скіравалася ў горад. На пасадзе яе сані (“тапкану”) акружылі баярскія дзеці і пешку суправадзілі іх да маста ў Верхні горад. Праз мост разам са спешыўшыміся кіраўнікамі маскоўскага пасольства (кн. С. І. Рапалоўскім і М. Я. Марозавым) Алена Іванаўна даехала да царквы Архангела Міхаіла, дзе вялікую князёўну маскоўскую віталі архімандрыт і іншыя святары. Згодна з загадам свайго бацькі, яна была павінна наведаць у Віцебску саборную царкву, а пасля накіравацца ў Полацк. Святары благаславілі князёўну крыжом, аднак у царкву яна не пайшла, а ў суправаджэнні баяр скіравалася на адпачынак у горніцу. На наступны дзень, пасля ўрачыстага малебна і абедні ў саборы, адмовіўшыся ад пачастунка (“хлеба тут не ела”) скіравалася на Полацк. Намеснік з віцеблянамі правялі пасольства на вярсту ад горада [13, с. 46; 15, с. 183].

Вітанне князёўны ў Полацку арганізоўвалі кіраўнік літоўскай дэлегацыі, князь Аляксандр Гальшанскі, Ян і Юрый Забярэзінскія, Юрый Зяновіч, якія не паехалі з пасольствам ў Віцебск, а адразу накіраваліся ў Полацк. Разам з усімі палачанамі яны сустрэлі маскавітаў за паўвярсты ад пасада горада. Далей шэсце было арганізавана, як у Смаленску і Віцебску: на пасадзе тапкану акружылі пешыя дзеці баярскія, якія суправадзілі пасольства да

моста, што вёў да святой Сафіі. Іван III у абавязковым парадку патрабаваў наведаць багаслужэнне "у святые Софьи у соборные церкви ей быти и молебен велети пети" [15, с. 167, 184]. У Сафійскім саборы яе сустрэў уладыка з крыжамі і святары. Пасля благаслаўлення полацкім епіскапам Алена Іванаўна прайшла ў царкву, дзе адстаяла малебен. Пасля багаслужэння ў суправаджэнні главаў абодвух дэлегацыі яна скіравалася да свайго двара (хіба рэзідэнцыі ваяводы полацкага). Там было загадана пачаставаць усіх паноў віном, а сама будучая гаспадарыня пазнаёмілася з некаторымі сваімі падданымі – жонкамі і дочкамі вышэйшыхураднікаў. На наступны дзень пасля абедні ў Святой Сафіі яна працягнула прымаць упамінкі, напрыклад, ад самаго ўладыкі, і адорваць чалабітнікаў сваёй ласкаю.

На жаль, на гэтым апісанне візіту абрываецца, і далей у дакументах і летапісах проста адзначаецца, што ўжо ў Вязыне і Маркаве Алену Іванаўну сустрэлі пасланцы вялікага князя Аляксандра і правадзілі да Вільні [15, с. 185]. Як мы бачым, тут цырыманіял сустрэчы Алены Іванаўны абмяжоўваўся публічнай сустрэчай і праездам па горадзе, нешматлікімі знаёмствамі з найбольш знатнымі асобамі. Публічных святкаванняў, па-за межамі храмаў, нейкіх народных забаў, урачыстых абедаў ці вячэр у крыніцах не фіксуецца. Гараджане Смаленска, Віцебска і Полацка выступаюць як агульны натоўп. Няма падзелу, як пры сустрэчы Вітаўта, па канфесійнаму прынцыпу: на каталікоў і праваслаўных, вітання з вынасам харугваў і мошчаў святых. Фактычна гэта было ўшанаванне ганаровых гасцёй, а не ўладарыні краю. Аддавалася належная пашана высокаму статусу пасольства, але не больш таго.

Паказальным можа быць апісанне сустрэчы імперскага пасольства 1517 г. у Маскву пад началам С. Герберштэйна ў Вільні, а потым у Полацку. Яго арганізацыя сведчыла пра высокі статус пасла і добразычлівае стаўленне да яго цэнтральных улад. С. Герберштэйна сустрэлі пасланцы ад вялікага князя недалёка ад Вільні, і перасадзіўшы яго ў багата аздобленны дыванамі, шытымі золотам падушкамі воз, выказваўшы ўсе знакі пашаны, суправадзілі да гаспод [16, с. 609]. Урачысты прыём яму аказалі і палачане. З некаторым здзіўленнем пасол апісвае агромны натоўп народу, які іх сустрэў, і цудоўны пачастунак, што быў ім прапанаваны [16, с. 613].

Наступнымі манархамі, якіх пабачылі Падзвінскія землі, сталі маскоўскі цар Іван IV Грозны і кароль польскі і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый. Аднак разрабаваны і часткова спалены Полацк быў не ў стане арганізаваць урачыстасці ў іх гонар. Зусім па іншаму тут быў прыняты маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч, які зімой 1656 г. наведаў Полацк. Нягледзячы на тое, што віталі яго натоўпы гараджан, як было прынята раней, на арганізацыю ўрачыстасці, відавочна, паўплывалі павевы барока.

Трыўмфальныя шэсці, што сталі папулярныя на землях Рэчы Паспалітай яшчэ ў другой палове XVI ст., аказалі непасрэдны ўплыў на публічныя відовішчы, прыўносячы ў іх пэўныя правілы і традыцыі. Да пачатку XVII ст. у гарадах Падзвіння сфарміраваліся свае традыцыі агульнагарадскіх рэлігійных гучных шэсцяў ("фэстаў"), якія мелі пэўны сцэнар і суправаджаліся музыкай, спевамі. Яны арыентаваліся на старажытнарымскія ўзоры і былі падпарадкаваныя агульным правілам. Усе ўдзельнікі (шляхціцы, розныя групы мяшчан, васковыя атрады) рухаліся ў вызначаным парадку, згодна створаным сценарам, у суправаджэнні музыкі, званоў, панегірычных прамоў [17, с. 47]. У канцы XVII – XVIII стст. звычайным элементам такіх урачыстасцей сталі феерверкі, салюты (віваты), ілюмінацыі. Дэкламацыі святочных прамоў, панегірыкаў, вершаў навучэнцамі брацкіх школ, у цэлым, не былі характэрны для праваслаўнай культуры, але шырока выкарыстоўваліся праваслаўнымі ў Падзвінні і Падняпроўі. Так, аўтарамі паэтычных "Метраў на прышэсце вялікага гасудара Аляксея Міхайлавіча" сталі выкладчыкі полацкай брацкай школы С. Пятроўскі-Сітніяновіч (Сімяон Полацкі), Ф. Утчыцкі і ігумен І. Іяўлевіч. У дадатак да "Метраў" ігумен вітаў цара ў 1656 г. асобнай "Прамовай да цара Аляксея Міхайлавіча" [17, с. 27–38; 19, с. 317]. Ускосныя ўзгадкі дазваляюць меркаваць, што падчас візіту была павінна адбыцца цырымонія ўрачыстай перадачы маскоўскаму цару абраза Багародзіцы, па паданні падараванага сабору св. Сафіі Аленай Іванаўнай, які ён забраў з сабою пад Рыгу [20, с. 14].

Наступным манархам, што наведаў Падзвінне, стаў рускі цар Пётр І. Саюзнік караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста ІІ у Паўночнай вайне разрабаваў уніяцкія святыні ў Віцебску і Полацку ў 1705 г., пераўтварыўшы храм св. Сафіі ў арсенал, вынікам чаго стала яе разбурэнне ў 1710 г.

Да агульнадзяржаўных ці агульнагарадскіх адносіліся і ўрачыстасці ў гонар вышэйшых духоўных ці свецкіх асоб. Вітанне духоўных іерархаў спалучала ў сабе рэлігійныя працэсіі і свецкія элементы. Так, 1 красавіка 1659 г. у Полацку віталі вяртанне з Масквы цудатворнага абраза, забранага раней Аляксеем Міхайлавічам. Цар "украсив ю златом и каменьями драгоценными" адправіў яго ў суправаджэнні Полацкага і Віцебскага епіскапа Каліста Рытаргайскага назад у Полацк [21, с. 122–124]. Пра традыцыйнасць вітання епіскапа падчас візітаў у XVII – XVIII стст. могуць сведчыць не толькі вершы Сімяона Полацкага, але і канты з песеннага зборніка XVII ст. з Маркавага Віцебскага манастыра, які зараз захоўваецца ў Пецярбургу[1].

Да свецкіх агульнагарадскіх мерапраемстваў можна аднесці святы ў гонар атрымання магдэбургскага права, заняцця пасад мясцовымі ўраднікамі: старастамі, ваяводамі, якія сталі праводзіцца ў гарадах Падзвіння з XVII ст. На жаль, у большасці выпадкаў факт іх правядзення проста занатоўваўся адным радком у гарадской хроніцы [14, с. 461]. Іх сцэнар можна аднавіць дзякуючы ўскосным звесткам – расходным кнігам магістратаў, успамінам сучаснікаў і перыёдыкі XVIII ст. Ён амаль дакладна паўтараў каранацыйныя сталічныя шэсці і, акрамя дэманстрацыі багацця і ўплывовасці новага ваяводы, быў павінен пазнаёміць кіраўніка рэгіёна з мясцовымі жыхарамі. Арганізацыя такіх святкаванняў звычайна ўскладалася на магістраты, якія і размяркоўвалі абавязкі паміж гараджанамі, узводзілі трыумфальныя аркі, вызначалі прамоўцаў. Абавязковым элементам такіх святкаванняў станавіліся

[1] Николаев Н.В. Книжная культура ВКЛ: дис. … канд. филол. наук. – СПб., 1997. – С. 64.

стрэлы з гарматаў, урачыстыя шэсці і прамовы, спяванне рэлігійных гімнаў. Як правіла, у час агульнагарадскіх цырымоній і шэсцяў выконваліся творы культава-абрадавых жанраў – Te Deum Laudamus, Salve Regina, Miserere Mei Deus і г.д. [7, с. 73]. Выканаўцамі музыкі на такіх агульнагарадскіх урачыстасцях былі як непасрэдныя іх удзельнікі, так і спецыяльна запрошаныя музыканты (касцёльныя арганісты, студэнты бурсаў, вайсковыя і прыватныя аркестры і капэлы). Адказнымі за арганізацыю ўсіх гарадскіх святаў быў магістрат, які размяркоўваў парадак шэсцяў, вызначаў час яго пачатку (звычайна 8–11 гадзін з раніцы), абавязкі ўсіх удзельнікаў, выдзяляў сродкі на музыку, упрыгожванне горада, пачастунак грамадзян [11, с. 35–36].

Так, у лютым 1731 г. уступленне князя Марцыяна Агінскага на ўрад віцебскага ваяводы, прымеркаванае да пачатку грамнічнага сойміку, было адзначана ў выглядзе трыумфа. Ужо напярэдадні прызначанага на 5 лютага шэсця ў горад пачалі з'язжацца ганаровыя госці, земскія і гродскія ўраднікі, землеўласнікі ваяводства. У святкаваннях былі задзейнічаны ўсё найбольш значныя гарадскія аб'екты – кляштары, замак, ратуша. Паміж Дабравешчанскай царквою і кляштарам дамініканаў была пастаўлена трыумфальная арка, багата ўпрыгожаная эмблемамі, гербам князя Агінскага і інскрыпцыямі[2]. У дадатак да шэсця цырымонія ўжо традыцыйна суправаджалася ўслаўленнем асобы ваяводы ў выглядзе ўрачыстых прамоў. Адна з іх аўтарства В. Дзянісевіча нават была выдадзена ў гэтым жа годзе [22].

У 1753 г. гараджане ўрачыста віталі ўжо ўезд новага ваяводы – Ю. Салагуба. Урачыста быў абстаўлены і ўезд у Браслаў новага старасты Гільзена ў 1739 г.[3] У 1758 г. жыхары Ушач святкавалі атрыманне прывілея на магдэбургскае права і лакацыю горада, а таксама правядзенне ярмарак і таргоў[4]. Абапіраючыся на згадкі, што такія святы адбываліся згодна з традыцыяй, можна меркаваць, што ў іх прымалі ўдзел рамесныя і рэлігійныя гарадскія карпарацыі са сваімі атрыбутамі: харугвамі, барабанамі.

Асабліва пышна святкаваліся дынастычныя святы: усшэсці на трон манархаў, іх тэзаімяніны. Адным з першых у крыніцах было апісана свята ў гонар каранацыі Аўгуста ІІ Моцнага, якое прайшло ў Віцебску 1 лістапада 1697 г. (хаця летапіс апісаў свята вельмі сціпла "Roku 1697. Król August wtóry koronowan miesionca Septembra pietnastego dnia w Krakowie. Miesionca Nowembra pierwszego dnia tryunf był w Witebsku" [14, с. 461]).

Горад (ратуша, касцёлы, брамы) былі ўпрыгожаны партрэтамі новага манарха, гербамі дзяржавы, ваяводства і самога Віцебска. Свята пачалося ў 7-8 гадзін раніцы з біцця ў ратушны звон. Прадстаўнікі цэхаў, урачыста ўбраныя, рушылі ад сваіх цэхавых дамоў да арсенала за зброяй, а пасля – да ратушы. На чале ішло кіраўніцтва цэха, а за ім, згодна з рангам, майстры, падмайстры і вучні. На плошчы каля ратушы натоўп віталі віцебскі ваявода А. Крышпін-Кіршанштэйн, члены магістрата і святары. Потым, разам са святарамі, войскамі гарнізона, шэсце рушыла на імшу да касцёла езуітаў і Уваскрасенскай царквы. Царкоўныя службы суправаджаліся салютам. Спачатку з мушкетаў стралялі прадстаўнікі цэхаў і яўрэйскіх карпарацый, а потым далі некалькі залпаў з "салютовак" (малых гармат). Пасля гэтага ўсе разыйшліся па сваіх цэхавых цэрквах і касцёлах. Скончылася свята пірамі і феерверкамі [11, с. 61–62].

У лістападзе 1764 г. у Віцебску былі арганізаваныя святы ў гонар каранацыі апошняга манарха Рэчы Паспалітай – Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У горадзе на адцінку ад ратушы да фарнага касцёла былі ўзведзены дзве трыумфальныя аркі. Вуліцы, па якім прайшоў каранацыйны парад, павінны былі быць прыбраныя піваварамі і асветлены (лой для плошак павінен быў даць мясцовы кагал). Свята пачыналася раніцаю з набажэнства ў фарным касцёле. Пасля сканчэння імшы натоўп быў павінен выслухаць першы панегірык (агалошаны Ф. Смыкам), а потым удзельнікі шэсця рушылі ў кірунку ратушы. Спыніўшыся каля трыумфальнай аркі на вуліцы і пры ратушнай браме, яны зноў слухалі панегірыкі. Кожная прамова суправаджалася стрэламі з гармат і апладысментамі. Для стварэння святочнай атмасферы на вуліцах горада гралі бурсакі, якія атрымалі за гэта ад гарадскога магістрата 102 злотых [6, с. 29]. Зыходзячы з распараджэння магістрата натоўп на вуліцах быў павінен частавацца мёдам, півам і віном, якія былі часткова закуплены магістрам, а часткова выстаўлены кагалам [23, с. 189].

Гучнымі падзеямі для ўсяго горада ці мястэчка станавіліся перанясенні рэліквій – мошчаў святых, цудатворных абразоў і г.д. Адной з першых, якая аб'яднала прадстаўнікоў усіх канфесій, стала цырымонія пахавання полацкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча. У студзені 1625 г. у пахавальнай працэсіі ў Полацку да сабора св. Сафіі, якую ўзначалілі езуіты, прынялі ўдзел не толькі каталіцкае, але і "русінскае" (тут маецца на ўвазе уніяцкае) святарства, шляхта і гарадскія цэхавыя аб'яднанні. Працэсія суправаджалася не толькі набажэнствамі, але і агалошваннямі панегірыкаў, напісаных на грэчаскай і лацінскай мовах, біццём у званы ў "русінскіх" і "лацінскіх" храмах [24, с. 359]. Святкаванне яго беатыфікацыі ў Полацку ў 1643 г. суправаджалася феерверкам і біццём у званы [25, с. 253], а на святочную імшу езуіты запрасілі ў сабор св. Сафіі гарадскія ўлады, шляхту, мяшчан і студэнтаў калегіума [25, с. 360].

Яшчэ больш тэатралізавана было абстаўлена вяртанне рэліквій Я. Кунцэвіча ў Полацк у 1668 г. Пасля заключэння Андрусаўскага перамір'я, зацверджаны ўжо кіеўскім мітрапалітам, Г. Календа арганізаваў урачыстае шэсце з машчамі Я. Кунцэвіча. Спачатку саркафаг быў адвезены ў Вільню, а адтуль у суправаджэнні вернікаў, сярод якіх былі і мясцовыя шляхціцы, шэсце рушыла з саркафагам у Полацк[5]. Шляхта Полацка і Віцебска на сабе, без коней, везла трыумфальны воз, на які было пакладзена цела пакутніка, і так давезла яго да кафедральнага сабора [26, s. 291]. Ужо 12 лістапада 1668 г. ён быў зноў размешчаны на алтары ў царкве св. Сафіі.

[2] Kurjer Polski. – 1731. – № 62. – S. 1.

[3] Kurjer Polski. – 1739. – № 132.

[4] Kuryer Polski. – 1758. – № 36. Dodatek.

[5] Российский государственный исторический архив (Санкт-Петербург). – Ф. 823. Д. 844.

У 1671 г. езуіты арганізавалі ў Полацку грандыёзнае святкаванне з нагоды кананізацыі Францыска Борджыа. У дадатак да трыумфальнага шэсця гарадскіх цэхаў і духавенства ў суправаджэнні "труб і капэлы" была пастаўлена п'еса ў яго гонар [5, с, 150].

У 1677 г. з вялікай помпаю адбылося ў Віцебску перанясенне рэліквій св. Язафата з езуіцкага касцёла да базыліян. Шэсце ўзначалілі базыліяне, якія неслі абраз св. Васілія, за імі з брамы езуіцкага касцёла рушылі рэліквіі. Балдахін над ім неслі мітрапаліт у пантыфікацыйным убранні і вышэйшыя ўраднікі ваяводства, у тым ліку Ш. К. Агінскі. Урачыстасць суправаджалася музыкай і стрэламі з гармат на працягу ўсяго шляху працэсіі ад касцёла езуітаў да саборнай царквы. Радны ўніяцкага брацтва перадаў мітрапаліту ключы ад царквы і агалосіў прамову з гэтай урачыстай нагоды. Пасля яе мітрапаліт аддаў ключы настаяцелю манастыра Я. Бражчыцу [27, s. 266].

18 чэрвеня 1757 г. ва Ушачах сыны мінскага ваяводы Яна Казіміра Жабы Францішак і Станіслаў (рэктар Віцебскага калегіума) пры вялікім натоўпе арганізавалі ўрачыстае перанясенне абраза Сэрца Ісуса з базыліянскай царквы ў дамініканскі касцёл. Былі запрошаны свецкія ўраднікі, манахі дамінікане, францішкане, езуіты, піяры, бернардзіны. Увесь горад быў цалкам ілюмінаваны. Кожны этап цырымоніі (прамовы, пачатак і сканчэнне шэсця) пачынаўся і сканчваўся салютам. Каля брамы дамініканскага касцёла абраз віталі адначасовыя спевы капэлы і стрэлы з гармат, якія суправаджалі ўнясенне абраза ў храм і размяшчэнне яго на аднаіменным алтары. Святкаванне працягнулася ўрачыстымі богаслужэннямі і казаннямі, як у царкве, так і касцёле на наступны дзень[6].

Важнейшымі нагодамі правядзення афіцыйных агульнагарадскіх святаў станавіліся агульнахрысціянскія святы. Некаторыя традыцыі, асабліва ў святкаванні Вялікадня і Божага Нараджэння аб'ядноўвалі вясковае і гарадское насельніцтва любой канфесіі ў рэгіёне. Так, на свята Божага Нараджэння вернікі хадзілі з зоркаю па вуліцах гарадоў і збіралі ахвяраванні на карысць цэркваў. У 1672 г. віцебскі ваявода А. Храпавіцкі спрабаваў забараніць гэты рытуал мяшчанам, замацаваўшы яго выключна за студэнтамі езуіцкага калегіума [25, с. 237–238].

Гучна святкавалася не толькі Божае Нараджэнне і Вялікдзень, але і Масленіца, Пакутны Тыдзень, Божае Цела і інш. Пры гэтым асобныя працэсіі праваслаўных, з вынасам плашчаніцы, хроснымі хадамі, падчас якіх вернікі б неслі абразы, свечы, у падзвінскіх гарадах не зафіксаваны. Прычыны гэтага крыюцца ў абмежаваннях, накладзеных менавіта на жыхароў Падзвіння пасля забойства І. Кунцэвіча. У 1635 гг. пасля пратэстаў Папскага прастола і кіраўнікоў уніяцкіх епархій Уладзіслаў IV Ваза забараніў мецъ праваслаўным цэрквы "у Полацку, дзе цела а. Язафата ляжыць і ў Віцебску, дзе той жа біскуп забіты, як перад элекцыяй было, так і зараз неўніяты ніводнай царквы мець не могуць" [29, с. 60–61]. Акрамя гэтага было забаронена праводзіць публічныя богаслужэнні, ці адпраўляць трэбы згодна са звычаямі праваслаўнай царквы. У дадатак да пакарання, вызначанага па законе, полацкі ваявода Януш Кішка ад свайго імя ў 1643 г. увёў яшчэ дадатковыя штрафы: на карысць дзяржаўнага скарбу – 50 тыс. злотых, а ваяводы і войта – 10 тыс. злотых. [14, с. 130]. У Полацку і Дзісне гэтую забарону ўдалося абыйсці заснаваннем брацтваў, але віцябляне былі пазбаўлены такой магчымасці. Фактычна ўрачыстасці праваслаўных брацтваў у рэгіёне былі вымушаны абмежавацца прасторай храмаў. Вынікам гэтага стала існаванне пры іх адразу некалькіх брацтваў, што дзейнічалі пры асобных алтарах ці прыдзелах храма. Так, у Полацку ў XVII – XVIII стст. пры Богаяўленскай царкве, акрамя агульнага Багаяўленскага брацтва, дзейнічалі асобныя Крыжаноснае брацтва, брацтва Прасвятой Дзевы Марыі, моладзевае брацтва[7], брацтва св. Мікалая[8]. У Дзісне, у дадатак да Уваскрасенскага (старэйшага) брацтва, у XVIII ст. з'явілася яшчэ два: малодшае і св. Мікалая. Акрамя агульнацаркоўных святаў, братчыкі былі павінны збірацца на малебны падчас святаў сваіх апекуноў (напрыклад, на святы Нараджэння і Успення Божай Маці), прыходзіць на ранішнюю службу да свайго алтара па серадах і збірацца на агульны сход штомесяц[9].

Агульнадзяржаўным рэлігійным святам ужо ў XVI ст. цэнтральная ўлада пачала лічыць каталіцкае свята Божага Цела. Цікава, што калі першапачаткова ў шанаванні каталіцкіх святых і адпаведных шэсцях прымалі ўдзел толькі каталікі, то ў сярэдзіне XVII – XVIII стст. выходзіць на іх (асабліва на свята Божага Цела) былі абавязаныя прадстаўнікі ўсіх канфесій і рамесных цэхаў [28, с. 336–337; 30, с. 488]. Віцебскі ваявода Ян Храпавіцкі ў 1672 г. афіцыйна замацаваў сваім універсалам афіцыйны статус свята Божага цела і рэгламентаваў парадак яго святкавання ў горадзе [25, с. 2]. Акрамя ўрачыстага хода з манстрацыяй, якая сімвалізавала труну, і богаслужэнняў пры чатырох алтарах пад небам, у Віцебску прадугледжваўся асобны парадак працэсіі. Бурмістры і лаўнікі, у незалежнасці ад свайго веравызнання, былі павінны ісці асобна ад натоўпа і несці балдахін над рэліквіямі [25, с. 238]. Напрыклад, у Чашніках у шэсці ў гонар Язафата Кунцэвіча былі павінны ўдзельнічаць не толькі мяшчане, але і насельніцтва ўсёй валасці [31, с. 225–226]. Фэсты часта суправаджаліся музыкай, ілюмінацыямі, феерверкамі [11, с. 88–90]. Так, феерверк, арганізаваны на замку каля сабора св. Сафіі ў Полацку, быў павінен завершыць свята ў гонар Непарочнага зачацця Дзевы Марыі ў снежні 1681 г. [32, с. 268].

Акрамя агульных рэлігійных святаў, у гарадах Падзвіння ў XVII – XVIII стст. урачыста адзначаліся пачатак восеньскага і вясновага семестраў, заканчэнне вучэбнага года ў езуіцкіх калегіумах, прыезд знакамітых гасцей. У залежнасці ад канкрэтнай нагоды і жанру, у час свята рабіліся тэатралізаваныя прадстаўленні (п'есы і інтэрмедыі, батлейкі) у касцёле ці перад касцёлам, на пляцы перад будынкам калегіума і ў яго сценах, на рынкавых плошчах. Для сустрэчы гасцей каля гарадской брамы дадаткова арганізоўваліся святочныя працэсіі па вуліцах горада, якія ўзыходзілі сваімі каранямі ў старажытныя традыцыі вітання свецкіх і духоўных правадыроў [33, s. 29–35].

---

[6] Kuryer Polski. – 1757. – № 30.

[7] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Ф. 1823. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 99.

[8] НГАБ. – Ф. 1823. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 268.

[9] Інститут Рукопису Націона́льної бібліоте́ки Украї́ни і́мені В. І. Верна́дського. – Ф. 194. № 134. Печ. д-т № XI.

Да пачатку XVII ст. удзел у розных гарадскіх шэсцях стаў абавязковым для ўсіх рамесных цэхаў і прапісваўся практычна ва ўсіх цэхавых статутах [32, с. 308; 36, с. 23]. Абавязковымі атрыбутамі такіх шэсцяў былі цэхавая харугва, ударныя музычныя інструменты (бубен ці барабан), а самі братчыкі, апранутыя ў суконныя ліўрэі ці іншае святочнае адзенне былі ўзброены агняпальнай і халоднай зброяй (мушкеты і шаблі) у знак гатоўнасці абараняць свой цэх і горад [32, с. 308; 35, с. 331]. Да іх дадаваліся святы ў гонар пакравіцеля самога цэха. На жаль, не захавалася апісанняў смотраў гарадскіх палкоў ці стралковых святаў у Віцебску і Полацку. Пра іх правядзенне ў ваяводскіх цэнтрах Падзвіння ўскосна сведчаць патрабаванні цэхавых статутаў, напрыклад, полацкіх кажэўнікаў канца XVII ст. Парадак іх правядзення можна ўявіць дзякуючы рэканструкцыі, зробленай на падставе апісанняў аналагічных святаў з розных гарадоў Беларусі А. Катлярчуком [11, с. 95–97].

**Заключэнне.** Такім чынам, мы бачым, што жыццё гараджан Падзвіння ў XV–XVIII стст. было насычана ўрачыстасцямі самага рознага ўзроўню: ад рэдкіх афіцыйных агульнадзяржаўных святаў кшталту візіта манарха, каранацыі да рэгулярных агульнагарадскіх свецкіх і рэлігійных цырымоній. У XVIII ст. разнастайных фэстаў стала так шмат, што ўніяты скардзіліся на падзенне інтарэсу да сваіх святых, бо мяшчане папросту не мелі магчымасці ўдзельнічаць ва ўсіх рэлігійных і публічных працэсіях [34, s. 12].

Да канца XVIII ст. адбываецца канчатковае размежаванне на гарадскую і вясковую, панскую і сялянскую культуры. Вясковае насельніцтва Падзвіння працягвае захоўваць гутарковую беларускую мову, традыцыі ў побыце, будаўніцтве жылля, адзенні, харчаванні. Святы застаюцца прывязанымі да земляробчага цыклу. Гарадская ж культура пад уплывам заходнееўрапейскіх традыцый набыла шэраг асаблівасцей. Акрамя блізасці для часткі гараджан земляробчых заняткаў, а значыць і святаў, з XVII ст. горад існаваў на мяжы двух прынцыпова розных традыцый святкаванняў: каталіцкай (разам з уніяцкай) і праваслаўнай. У гарадской культуры ўзрастае колькасць свецкіх ўрачыстасцей. У арганізацыі святаў, як свецкага, так і рэлігійнага характару з’яўляюцца элементы, характэрныя для культуры барока: панегірыкі, феерверкі, ілюмінацыі. Дзякуючы рэлігійным абмежаванням афіцыйных улад, жыхары Падзвіння прымусова ўцягваюцца ў агульнагарадскія святкаванні па каталіцкім узоры, што паскарала пранікненне заходнееўрапейскай культуры ў побыт шырокіх мас насельніцтва.

У той жа час, мы не назіраем ў рэгіёне праяў фарміравання ўстойлівай карнавальнай культуры, характэрнай для каталіцкай гарадской культуры. У адрозненні ад сталічных гарадоў, у першую чаргу Вільні, і двароў магнатаў ВКЛ, якія актыўна ўспрымалі традыцыі маскарадаў, карнавалаў, прывязаных як да рэлігійных, так і свецкіх святаў, на ўсходзе Беларусі яны працягвалі існаваць у “карналізаваных” відовішчах у форме калядных і валачобных (у сельскай мясцовасці) абыходаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Бахтин М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса. – Л.: Наука, 1965. – 527 с.
2. Ле Гофф Ж. Цивилизация средневекового Запада. – М.: «Прогресс–Академия», 1992. – 376 с.
3. Гуревич А.Я. Проблемы средневековой народной культуры. – М.: Искусство, 1981. – 359 с.
4. Даркевич В.П. Народная культура Средневековья: светская и праздничная жизнь в искусстве IX–XVI веков. – М.: Наука, 1988. – 342 с.
5. Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: беларуская літаратура пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.). – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.
6. Дадзіёмава В. З гісторыі музычнай бурсы пры Віцебскім езуіцкім калегіуме // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 26–31.
7. Дадзіёмава В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі да ХХ стагоддзя: да 80-годдзя Беларус. дзярж. акад. музыкі. – Мінск: Беларус. дзярж. акад. музыкі, 2012. – 230 с.
8. Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII в. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 290 с.
9. Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнееўрапейскі першадрукар. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.
10. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 245 с.
11. Котлярчук А. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII в. – СПб.: “Петербургское востоковедение”, 2001. – 240 с.
12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск: БелСЭн, 1989. – 573 с.
13. Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. – СПб.: Тип. III Отд. Собств. Е.И.В. Канцеляріи, 1855. – 364 с.
14. Витебская старина (далее Витебская старина): в 5 т. / сост. и изд. А.П. Сапунов. – Витебск: Тип. Губ. правл., 1883–1888. – Т. 1: Известия русских и литовских летописей о Витебске. – 1883. XXIV. – 669 с.
15. Сборник Императорского Русского Исторического Общества. СПб., 1867–1916. – 148 т. – Т. 35: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством в царствование Великого Князя Ивана Васильевича. – Ч. 1 (годы с 1487 по 1533). – СПб.: Тип. Ф. Елеонского и К°, 1882. – 870 с.
16. Герберштейн С. Записки о Московии: В 2 т. – Т. 1: Латинский и немецкий тексты, русские переводы с латинского А.И. Малеина и А.В. Назаренко, с ранненововерхненемецкого А.В. Назаренко. – М.: Памятники исторической мысли, 2008. – 776 с.
17. Клімуць Л.Я. Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях. – Мінск: Беларусь, 2013. – 127 с.
18. Симеон Полоцкий. Вирши / Сост., подготовка текстов, вступ. ст. и комм. В.К. Былинина, Л.У. Звонаревой. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – 448 с.
19. Древняя российская вивлиофика: Содержащая в себе: собрание древностей российских, до истории, географии и генеалогии российския касающихся / Изд. Н. Новиковым. – Изд. 2. – М.: Тип. Комп. типографич., 1788. Ч. III. – 480 с.
20. Сапунов А. Древние иконы Богоматери в Полоцкой епархии / А. Сапунов. – Витебск: Тип. Губ. правл., 1888. – 15 с.

21. Шалина И. Икона Богоматери Одигитрии – древняя икона Полоцкого Софийского собора (Icon of the Odigitria – ancient icon of St. Sophia Cathedral in Polotsk) // Seminarium Bulkinianum: сб. ст. к 60-летию со дня рождения В.А. Булкина / науч. ред.: И.В. Антипов, И.А. Шалина. – СПб.: Каламос, 1999. – С. 121–129.
22. Denisewicz B. Applauz Głośnobrzmiącey Sławy Solennymi Tryumfow Ceremoniámi ná Godność Woiewodztwa Witebskiego (…) P. Marcyanowi z Kozielska Oginskiemu Woiewodźie Witebskiemu, (…) Starości Wstępuiącemu rezunuiący. Gdźie Tryumfalna Jásnoświetnemi Domu Prześwietnego otoczona mistyczney Gwiazdy Broma promieniámi, Zgromádzone w sobie naywyszych [sic] godności Insignia reprezentuiąca dla solennieyszego tryumfu przy tym samymże Applaużie publicznemu Aktowi Rythmem Polskim Notyfikuie Się. – [Supraśl], 1731. – 8 k.
23. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской (далее – ИЮМ): в 32 вып. / ред.: А.М. Сазонов. – Витебск: Тип. Губ. правл., 1871–1906. – Вып. 19. – Витебск, 1889. – XXII, 496, XXXII с.
24. Родэвальд Ш. Пра ўшанаванне Язафата Кунцэвіча / Беларускі гістарычны агляд. – Т. XVI. – 2009. – С. 345–372.
25. Витебская старина. – Т. 5. Ч. 1: Материалы для истории Полоцкой епархии: с 47 отдельными приложениями. – 1888. – [2], 650, XX с.
26. Stebelski I. Dwa Wielkie Swiatła Na Horyzoncie Połockim. – T. 2. – Wilno: w Drukarni Bazylianskiey, 1782. – 474 s.
27. Wereda D. Rozwój kultu Jozafata Kuncewicza w XVIII wieku // Śladami unii brzeskiej / red. R. Dobrowolski, M. Zemło. – Lublin; Supraśl: KUL, 2010. – S. 258–266.
28. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси (далей АСД). – Т. 1. – Вильна : Печатня губ. прав., 1867. – X с. + 409 с.
29. АСД. – Т. 2. – Вильна: Печатня губ. прав., 1867. – 391 с.
30. ИЮМ. – Вып. 18. – Витебск, 1888. – VIII, 492, XLI, [6] с.
31. ИЮМ. – Вып. 26. – Витебск, 1895. – XXII, 516, XXXIV с.
32. ИЮМ. – Вып. 6. – Витебск, 1874. – 411 с.
33. Breżgo, B. Sztuki piękne w kolegium oraz w Akademii OO. Jezuitów w Połocku w XVIII i XIX w. / B. Breżgo // Prace Sekcji Hist. Sztuki Wil. Tow. Przyj. Nauk. – № 3 (1939). – S. 29–39.
34. Ważyński, P. Kazanie na uroczystość bł. Jozafata Kuncewicza / P. Ważyński. – Wilno: b/m, 1782. – 34 s.
35. ИЮМ. – Вып. 5. – Витебск, 1874. – 414 с.
36. Клименко, В. Ф. Западнорусские цеха: историко-этнографическое исследование / В. Ф. Клименко. – Киев: Тип. Импер. Универ. св. Владимира Акц. О-ва печ. и изд. дела Н. Т. Корчак-Новицкого, 1914. – 166 с.


*Поступила 18.10.2022*

## ОФИЦИАЛЬНЫЕ ТОРЖЕСТВЕННЫЕ ЦЕРЕМОНИИ В ПОЛОЦКОМ И ВИТЕБСКОМ ВОЕВОДСТВАХ (ЗЕМЛЯХ) В XV–XVIII ВВ.

***А.А. СКЕПЬЯН***
***(Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*Одним из главных механизмов, которые объединяют людей, формирует и демонстрирует определенную систему ценностей, отличие в восприятии окружающего мира, является торжество, праздник. Они отмечают важнейшие вехи человеческой жизни: личной (рождение, вступление в брак, смерть) и общественной. Уже в начала XV в. в городах и местечках Великого Княжества Литовского начинает формироваться своеобразная городская культура. Её неотъемлемой частью становятся различные церемонии, шествия, ритуалы, приуроченные как к светским, так и церковным праздникам и торжествам. В условиях насильственного закрытия православных храмов и монастырей, распространения униатства именно городской праздник стал тем мостом, который объединял жителей города различных конфессий и социальных слоев.*

***Ключевые слова**: городская культура, торжества, церемонии, церковные и светские праздники, Великое Княжество Литовское, Подвинье.*

## OFFICIAL FESTIVE CEREMONIES IN POLOTSKY AND VITEBSK VOIVODESHIPS (LANDS) IN THE XV – XVIII CENTURIES

***A. SKIEPYAN***
***(The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*One of the main mechanisms that unite people, forms and demonstrates a certain system of values, the difference in the perception of the surrounding world is a celebration, a holiday. They mark the most important milestones of life: personal (birth, marriage, death) and social. Already at the beginning of the 15th century, in the cities and towns of the Grand Duchy of Lithuania, a peculiar urban culture began to form. Various ceremonies, processions, rituals dedicated to both secular and church holidays and celebrations become its integral part. In the context of the forced closure of Orthodox churches and monasteries, the spread of Greek Catholic Church, it was the city holiday that became the bridge that united the inhabitants of the city of various confessions and social strata.*

***Keywords:** urban culture, celebrations, ceremonies, church and secular holidays, Grand Duchy of Lithuania, Podvin'e.*